Культура Советской Чувашии: (к 70-летию автономии республики). Чебоксары, 1989; Скворцов М.И. Культура Чувашского края. М., 1995.

*К.Ф.Быкаў* (прырода, гаспадарка), *Ю.В.Бажэнаў*, *Дз.Н.Міхлееў* (гісторыя), *Дз.Н.Міхлееў* (культура).

**ЧУГА́ЕЎ** Леў Аляксандравіч (16.10.1873, Масква — 23.9.1922), расійскі хімік, стваральнік навук. школы па хіміі комплексных злучэнняў. Скончыў Маскоўскі ун-т (1895). З 1895 заг. хім. аддзялення Бактэрыял. ін-та ў Маскве. З 1904 праф. Маскоўскага тэхн. вучылішча, у 1908—22 — С.-Пецярбургскага ун-та. Заснавальнік і дырэктар (з 1918) Ін-та па вывучэнні плаціны і інш. высакародных металаў. Навук. працы па хіміі тэрпенаў; распрацаваў метад вызначэння рухомых атамаў вадароду ў арган. злучэннях. Адкрыў і вывучыў анамальную вярчальную дысперсію арган. малекул з 2 асіметрычнымі цэнтрамі. Адкрыў адчувальныя аналіт. рэакцыі на металы VIII групы перыяд. сістэмы элементаў (1906). Прэмія імя У.І.Леніна 1927.

*Тв.*: Избр. труды. Т. 1—3. М., 1954—62.

**ЧУДАКО́Ў** Алег Парфір'евіч (н. 23.10.1940, г.п. Сураж Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне сківічна-тваравай хірургіі. Заснавальнік і прэзідэнт Бел. асацыяцыі сківічна-тваравых хірургаў. Д-р мед. н. (1975), праф. (1977). Засл. дз. нав. Беларусі (1997). Скончыў Пермскі мед. ін-т (1964). З 1968 у Цюменскім мед. ін-це (з 1979 заг. кафедры). З 1980 у Мінскім мед. ун-це (заг. кафедры), адначасова (1986—88) прарэктар па навук. рабоце. З 1992 гал. спецыяліст па сківічна-тварнай і пластычнай хірургіі. Навук. працы па метадах пластычнага аднаўлення вял. дэфектаў твару і шыі.

*Тв.*: Компрессионно-дистракционный метод остеосинтеза в костной пластике нижней челюсти. Мн., 1985; Травматические переломы нижней челюсти, их осложнения и лечение. Мн., 1989.

**ЧУДАКО́Ў** Барыс Сцяпанавіч (н. 8.6.1932, станіца Сляпцоўская Сунжанскага р-на, Інгушэція), бел. ваенны дырыжор. Засл. арт. Беларусі (1981). Скончыў Ін-т ваен. дырыжораў Мін-ва абароны СССР (1954). З 1954 дырыжор вайск. часці БВА, з 1961 у Мінскім суворaўскім ваен. вучылішчы, з 1968 дырыжор аркестра штаба БВА, з 1979 нач. арк. службы БВА. З 1989 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі. Сярод пералажэнняў Ч. для духавога аркестра творы бел. кампазітараў У.Алоўнікава, Г.Вагнера, Я.Глебава, І.Лучанка, Ю.Семянякі, Дз.Смольскага, муз. класікі і інш. Інструментаваў для духавога аркестра Дзярж. гімн Рэспублікі Беларусь (2002). Гал. дырыжор Рэсп. (1987) і абл. «Майскі вальс» (штогодняе, з 1992) свят духавой музыкі. *А.Л.Карацееў.*

**ЧУДАКО́Ў** Давід Абрамавіч (23.6.1902, г.Сураж Бранскай вобл., Расія — 1983), бел. вучоны ў галіне трактарабудавання. Д-р тэхн. н. (1955), праф. (1956). Засл. дз. нав. Беларусі (1968). Скончыў С.-г. акадэмію імя Ціміразева (1927). У 1955—72 заг. кафедры Бел. ін-та механізацыі сельскай гаспадаркі. Навук. працы па асновах тэорыі с.-г. навясных агрэгатаў, тэорыі трактара і разліку яго механізмаў. Узначальваў распрацоўку трактарных гідрапад'ёмнікаў для кіравання навяснымі с.-г. машынамі.

*Тв.*: Основы теории и расчета трактора и автомобиля. 2 изд. М., 1972. *Л.В.Бароўка.*

**ЧУДАКО́Ў** Яўген Аляксеевіч (1.9.1890, г. Плаўск Тульскай вобл., Расія — 19.9.1953), расійскі вучоны ў галіне машыназнаўства і аўтамаб. тэхнікі. Акад.



Л.А.Чугаеў.



Я.А.Чудакоў.

АН СССР (1939; чл.-кар. 1933). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1916), дзе працаваў у 1918—28 і з 1936 (заг. кафедры). З 1921 дырэктар Навук. аўтаматорнага ін-та, з 1930 нам. дырэктара, заг. сектара Навук. аўтатрактарнага ін-та. З 1939 дырэктар Ін-та машыназнаўства АН СССР. У 1939—42 віцэ-прэзідэнт АН СССР. Навук. працы па праблемах устойлівасці аўтамабіля, трываласці і зносаўстойлівасці яго дэталей. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1951.

*Тв.*: Теория автомобиля. 3 изд. М.; Л., 1950.

**ЧУ́ДАЎ МАНАСТЫ́Р**, Аляксееўскі Архангела-Міхайлаўскі, мужчынскі манастыр рус. правасл. царквы ў Маскоўскім Крамлі. Засн. каля 1358—65 мітрапалітам *Аляксеем*. Да 1561 яго ігумен лічыўся першым сярод ігуменаў рас. манастыроў. З канца 14 ст. цэнтр кнігапісання. У 17 ст. ў манастыры дзейнічала грэка-лац. вучылішча. Скасаваны пасля Кастр. рэвалюцыі 1917, будынкі (16—19 ст.) знесены ў 1930-я г. Збор рукапісаў Ч.м. 11—13 ст. зберагаецца ў Гіст. музеі Масквы.

**ЧУ́ДЗІН**, вёска ў Ганцавіцкім р-не Брэсцкай вобл., на р. Лань, на аўтадарозе Ганцавічы—Чырвоная Слабада. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 40 км на У ад горада і чыг. ст. Ганцавічы, 286 км ад Брэста. 1016 ж., 411 двароў (2003). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Брацкія магілы партызан і ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Георгіеўская царква (1867).

**ЧУ́ДЗІНСКІ БОЙ 1942**, бой партыз. атрада В.А.Васільева па разгроме ням. гарнізона ў в. Чудзін Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Гарнізон (каля 400 гітлераўцаў), узброены вінтоўкамі і 4 кулямётамі закрываў партызанам выхад цераз р. Морач у лясы Ганцавіцкага р-на. У ноч на 11 кастр. партызаны сканцэнтраваліся на Пн ад в. Чудзін, зрабілі засады на шляхах магчымага адступлення праціўніка. На досвітку ў выніку 1,5-гадзіннага бою часткова быў знішчаны ўзвод аховы гарнізона, але частка гітлераўцаў вырвалася і схавалася ў балотах. Партызаны захапілі 6 радыёпрыёмнікаў, вінтоўкі, запас патронаў, веласіпеды і інш. Гарнізон не аднавілі, што пашырыла партыз. зону. *М.Ф.Шумейка.*

**ЧУДЗЬ**, назва ў рускіх летапісах *эстаў* (эстонцаў), а таксама інш. фіна-угорскіх плямён, што жылі ва ўладаннях *Наўгародскай феадальнай рэспублікі* або ў суседніх з ёй рэгіёнах, на У ад Анежскага воз. — на р. Анега і Паўн. Дзвіна.

**ЧУ́ДСКА-ПСКО́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА**, Гдоўскае, Пейпсі. У Эстоніі і Пскоўскай вобл. Расіі. Пл. 3,5 тыс. км$^2$. Глыб. да 15 м. Складаецца з *Чудскога возера*, *Пскоўскага возера* і пралівa, што іх злучае (Цёплае возера). З'яўляецца рэліктам вял. ледавіковага вадаёма. Берагі пераважна нізінныя, тарфяныя, затапляюцца ў паводку; на плоскім дне магутная тоўшча ілу. Уздоўж паўн. і ўсх. берагоў Чудскога воз. цягнецца пясчаны *бар*, месцамі парослы хвояй. Шмат астравоў, найбуйн. — Пірысар (Порка). Упадае каля 30 рэк (найбольшыя Вялікая і Эмайыгі), выцякае р. Нарва. Замярзае ў ліст., крыгалом у маі. Згоннанагонныя з'явы. Суднаходства. Рыбалоўства.

**ЧУДСКО́Е ВО́ЗЕРА** (эст. Пейпсіярв). На мяжы Эстоніі і Пскоўскай вобл. Расіі. Пл. 2,6 тыс. км$^2$. Складае адзіны вадаём з Пскоўскім воз. (гл. *Чудска-Пскоўскае возера*). У 1242 на Ч.в. адбылася бітва рус. войска з ням.-тэўтонскімі рыцарамі (гл. *Лядовае пабоішча 1242*).

**ЧУЖА́Я МО́ВА**, 1) выказванне іншай асобы, выкладзенае аўтарам або апавядальнікам. У залежнасці ад лексіка-сінтакс. сродкаў і спосабаў перадачы Ч.м. адрозніваюцца *прамая мова, ускосная мова* і няўласна-прамая мова. Шырокае выкарыстанне Ч.м. — характэрная асаблівасць *мастацкага стылю* і *размоўнага стылю*.

Кожная з разнавіднасцей Ч.м. мае свае стыліст. асаблівасці. Прамая мова, якая дакладна адлюстроўвае мову персанажа, а таксама ўключае словы аўтара, дапамагае пісьменніку адлюстраваць моўныя асаблівасці геро-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ